Источник: "Краязнаўчая газета" - 2014-07-10

# Ліпень

**15 – Макарэвіч Васіль Сцяпанавіч** (1939, Крупскі р-н), паэт, журналіст, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова (1994) – 75 гадоў з дня нараджэння.

**18 – Радзялоўская Алена Паўлаўна** (1904, Польшча – 1971), беларуская актрыса, народная артыстка Беларусі – 110 гадоў з дня нараджэння.

**18 – Шутаў Генадзь Фёдаравіч** (1939, Украіна), графік, акварэліст, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2011) – 75 гадоў з дня нараджэння.

**19 – Вітан-Дубейкаўскі Лявон Іванавіч** (Леў Дубяйкоўскі; 1869, Мсціслаўскі р-н – 1940), беларускі паэт, архітэктар, педагог, збіральнік беларускага фальклору – 145 гадоў з дня нараджэння.

**20 – Анічэнка Уладзімір Васільевіч** (1924, Хоцімскі р-н – 2001), мовазнаўца, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1988) – 90 гадоў з дня нараджэння.

**20 – Каробушкіна Таццяна Мікалаеўна** (1934, Расія), вучоны-археолаг, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2002) – 80 гадоў з дня нараджэння.

**21 – Каваленка Віктар Антонавіч** (1929, Валожынскі р-н – 2001), беларускі літаратуразнаўца, крытык, пісьменнік, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі – 85 гадоў з дня нараджэння.

**22 – Давыдаў Валянцін Канстанцінавіч** (1934, Расія), беларускі артыст балета, народны артыст Беларусі – 80 гадоў з дня нараджэння.

**22 – Салавей Ларыса Фёдараўна** (1934, Орша), мастацтвазнаўца, даследчык пытанняў беларускага выяўленчага мастацтва, эстэтычнага выхавання і музеязнаўства, заслужаны настаўнік Беларусі – 80 гадоў з дня нараджэння.

**24 – Гарбук Генадзь Міхайлавіч** (1934, Ушацкі р-н), беларускі акцёр, народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1966) і Дзяржаўнай прэміі СССР (1984) – 80 гадоў з дня нараджэння.

**27 – Азбукін Мікалай Васільевіч** (1894, Бабруйск – 1943), беларускі географ, краязнаўца, публіцыст, дзеяч беларускага нацыянальнага руху – 120 гадоў з дня нараджэння.

**27 – «Фальварак Ракуцёўшчына»** (Маладзечанскі р-н; 1994), філіял Літаратурнага музея Максіма Багдановіча – 20 гадоў з часу адкрыцця.

**28 – Ермалёнак Вітольд Антонавіч** (1954, Браслаўскі р-н), гісторык, краязнаўца, педагог, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» (1999) – 60 гадоў з дня нараджэння.

**28 – Лаўшук Сцяпан Сцяпанавіч** (1944, Рэчыцкі р-н), літаратуразнаўца, крытык, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кавалер ордэна Ф. Скарыны – 70 гадоў дня нараджэння.

**31 – Ленсу Міхаіл Якаўлевіч** (1924, Расія), вучоны-філосаф, заслужаны работнік культуры Беларусі – 90 гадоў з дня нараджэння.

"Краязнаўчая газета". Ліпень